В номере:
Охрана открыла двери

Профессия – создавать уют

Лето с пользой



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№42 (10860)

8 чэрвеня 2019 года Субота

ЗАВТРА – ДЕНЬ РАБОТНИКОВ ЛЕГКОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ


Литейщик изделий цеха №2 Валентина Требушевская
(Продолжение темы – на 7 с.)
Фото Евгения УСТИНОВА

## Весткі з месцаў

### Каб прымяніць лепшае

**Дэлегацыя сельгаспрадпрыемства "Завідаўскае" наведала міжнародную спецыялізаваную выставу "Белагра – 2019".**

Як расказала намеснік дырэктара гаспадаркі Таццяна Шчучэнка, 17 спецыялістаў паехалі ў Мінск не дзеля цікавасці, а з намерам пазнаёміцца з навінкамі сельгастэхнікі.

– Менавіта на гэтай выставе ў мінулым годзе нашы механізатары пратэсціравалі некаторыя трактары і агрэгаты, – расказала яна. – Пазней прадпрыемства набыло навінкі і ў мінулую пасяўную актыўна іх выкарыстоўвала.

Сяргей ЧАЙДАК

### Рух на п'едэстал

Дабрушане прынялі ўдзел у адкрытай спартакіядзе па паралімпійскіх відах спорту сярод інвалідаў апорна-рухальнага апарата. Днямі яна прайшла ў абласным цэнтры і сабрала больш за 70 удзельнікаў. Яны спаборнічалі ў настольным тэнісе, плаванні, лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту.

Дабрушанін Віктар Медзведзькоў стаў трэцім сярод інвалідаў-калясачнікаў у бочча – адаптаванай гульні для людзей з парушэннямі рухальных функцый.

Таццяна АХРАМЕНКА

Делу – время, подписке – час!

Для участия нужно:
ПОДПИСАТЬСЯ НА II ПОЛУГОДИЕ 2019 ГОДА
ПРИНЕСТИ (ПРИСЛАТЬ) КОПИЮ КВИТАНЦИИ В РЕДАКЦИЮ


Утюг Galaxy


Чайный сервиз

Цена подписки
На месяц – 6,6 рубля.
На квартал – 19,8 рубля.
На полугодие – 39,6 рубля.


Блендер Galaxy

«ДК» – газеТА, КОТОРУЮ ЛЮБЯТ

Поучаствуйте в рекламной акции «ДК» и получите шанс стать обладателем одного из подарков:


Велосипед «Десна»



ISSN 2073-1000

## погода

Долгота дня 16.57
Луна
8 июня – во Льве,
9, 10 – в Деве

Первая четверть 10 июня

**9 июня**
НОЧЬЮ +17…+19
ДНЕМ +27…+29
Переменная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер ю.-восточный 1-3 м/с.

**10 июня**
НОЧЬЮ +18…+20
ДНЕМ +26…+28
Небольшая облачность.
Небольшой дождь.
Ветер восточный 1-3 м/с.

## С Днем работников легкой промышленности!



Ежедневно легкая промышленность делает нашу жизнь лучше, привнося в нее красоту и комфорт. Мастерство, трудолюбие и профессионализм ее работников позволяют обеспечивать население товаром высокого качества.

Сегодня благодаря добросовестному труду коллектива Добрушского фарфорового завода продукция добрушского предприятия известна не только в Республике Беларусь, но далеко за ее пределами.

Дорогие заводчане, примите искренние пожелания трудовых успехов, оптимизма, благополучия и радости. Пусть любовь и поддержка близких вдохновляют вас на успешную реализацию всех планов.

**Районный исполнительный комитет**
**Районный Совет депутатов**

## Анонс

Сегодня в районе состоятся выпускные балы школьников и гимназистов. Торжества по традиции начнутся городским праздником, который пройдет на центральной площади. Начало – в 18.00. Торжество продлится до 19.20.

Кульминацией праздника станет исполнение вальса выпускниками школ города и гимназии.

**Оргкомитет**

### НА СВЯЗИ

**19 июня с 15.00 до 17.00**
**по телефону (0232) 33-12-37**
в Гомельском областном исполнительном комитете пройдет прямая телефонная линия с участием Юрия Витольдовича ШУЛЕЙКО, помощника Президента Республики Беларусь – инспектора по Гомельской области.

* * *

**10 июня с 10.00 до 12.00 по телефону 3-12-48** пройдет прямая телефонная линия с участием Владислава Гисматовича ГАСЫМОВА, начальника отдела внутренних дел райисполкома.

### II ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ

# Эстафету прыняў Гомель

**Флэшмобам і танцамі сустрэлі ў абласным цэнтры сімвал II Еўрапейскіх гульняў – "Полымя міру"**

**Вечарам у мінулую сераду на пляцоўцы каля Лядовага палаца, дзе і пачыналася падарожжа "Полымя міру" па Гомельшчыне, панаваў вясёлы настрой. Дзеці і падлеткі, а іх тут было больш за ўсіх, з нецярпеннем чакалі ўдзельнікаў эстафеты. Яно і зразумела: магчымасць убачыць полымя, запаленае ў Рыме, выпадае нячаста. Таму і лампадку сустракалі працяглымі апладысментамі.**



– Прыйшла і наша чарга дакрануцца да значнай спартыўнай падзеі, – вітаў гараджан і гасцей Гомеля старшыня гарадскога выканаўчага камітэта Пётр Кірычэнка. – Спадзяюся, што пасля падарожжа па нашай зямлі "Полымя міру" запаліць у сэрцах спартсменаў дух перамогі. А мы будзем хварэць за беларускую зборную, у складзе якой каля сарака жыхароў і ўраджэнцаў нашай вобласці.



Факел ад лампады запалілі Пётр Кірычэнка і старшыня Беларускай федэрацыі альпінізму Аляксандр Гадлеўскі. Ён і стаў першым факеланосцам. Шэсце агню па горадзе на рэтрааўтамабілі працягнуў канаіст, першы ў гісторыі беларускага спорту алімпійскі чэмпіён 1960 года Леанід Гейштар. Менавіта ў Рыме ён заваяваў залаты медаль Алімпійскіх гульняў.

Маршрут факеланосцаў праходзіў па вуліцы Савецкай з некалькімі прыпынкамі. Полымя II Еўрапейскіх гульняў сустракалі на кандытарскай фабрыцы "Спартак", дзе менавіта да гэтага моманту адлілі з белага шакаладу копію факела вагой 4,5 кілаграма, утрая цяжэйшую за арыгінал. "Полымя міру" спынялася каля цырка, у скверы імя Андрэя Грамыкі, цэнтральным парку. Яго ўзнялі на назіральную пляцоўку былога цукразавода. Увесь час факеланосцы мяняліся. Полымя перадавалася з рук у рукі знакамітым спартсменам Гомельшчыны: алімпійскім чэмпіёнам і прызёрам Раману Петрушэнку, Андрэю Краўчанку, Сяргею Смалю, Марыі Мамашук, Вользе Худэнка і іншым.





Маршрут першага дня завяршыўся на плошчы імя Леніна, дзе агонь Еўрапейскіх гульняў перадалі выконваючаму абавязкі старшыні аблвыканкама Генадзю Салаўю. Урачыстасць працягнулі свята "Фанфары Гомельшчыны" і вялікі канцэрт з удзелам папулярных выканаўцаў.

Нагадаем: на Гомельшчыне "Полымя міру" будзе гасцяваць да 10 чэрвеня. У чацвер факел прывезлі ў Жлобін, потым – у Мазыр, Тураў, нацыянальны парк "Прыпяцкі".

**Сяргей ВОЛЬГІН**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

### В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Кооперация в сфере технологий

**Президент Беларуси Александр Лукашенко подтвердил стремление Беларуси к дальнейшему развитию сотрудничества со Всемирной организацией интеллектуальной собственности.**

Об этом глава государства заявил на встрече с генеральным директором Всемирной организации интеллектуальной собственности (ВОИС) Фрэнсисом Гарри, передает корреспондент БелТА.

Александр Лукашенко отметил, что в ходе визита Фрэнсиса Гарри стороны подпишут меморандум о сотрудничестве между правительством Беларуси и ВОИС. В нем будут определены и закреплены уже достигнутые основные моменты совместной деятельности. "Нам многому надо учиться. Вы нам в этом отношении помогаете очень много. Особенно в плане образовательных программ, поддержки наших специалистов. Я вам за это очень благодарен», – сказал Александр Лукашенко.

В свою очередь Фрэнсис Гарри отметил достоинства белорусской столицы, где заботятся об окружающей среде и поддерживают ее в чистоте. «Это очень красивый, очень интересный город», – сказал он. Гендиректор ВОИС также поблагодарил Беларусь за поддержку, оказываемую международной организации. «На сегодняшний день наша организация переживает не самые легкие времена. Поэтому мы вдвойне ценим поддержку и сотрудничество», – подчеркнул Фрэнсис Гарри.

**По материалам БелТА**

### АЎКЦЫЁНЫ

# Набыць школу са зніжкай

Будынак школы-дзіцячага садка і кацельні ў Антонаўцы адным лотам выстаўлены на электронныя таргі Беларускай універсальнай таварнай біржы.

Як паведамляе камітэт дзяржмаёмасці аблвыканкама, аб'екты Добрушскага раёна агульнай плошчай больш за 1,8 тысячы квадратных метраў прапануюцца са зніжкай у 80 працэнтаў за 183,3 тысячы рублёў.

На папярэдніх электронных таргах з 32 лотаў новых гаспадароў знайшлі 9 аб'ектаў. У гэты раз на продаж выстаўлены 10 аб'ектаў абласнога цэнтра і сямі раёнаў Гомельшчыны.

**Сяргей ЧАЙДАК**